

# КРЫНІЧКА

Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Чэрнікаўшчынская базавая школа”

Выпуск №4 (29)
Снежань 2022

## У нумары:

**1 снежня – Сусветны дзень барацьбы са СНІДам — Стар. 1**
**Паездка ў Цэнтр бяспекі МНС — Стар. 2**
**Сустрэча з інспектарам Дзяржынскага РАНС — Стар. 3**
**Навіны школьнага лагера “Сонейка” — Стар. 4**
**Навагоднія мерапрыемствы — Стар. 5**
**Шосты школьны дзень — Стар. 6**

# 1 снежня – Сусветны дзень барацьбы са СНІДам




У рамках плана мерапрыемстваў, прымеркаваных да Сусветнага дня барацьбы са СНІДам, з 28 лістапада па 3 снежня ў школе прайшлі шматлікія мерапрыемствы гэтай тэматыкі.

На класнай гадзіне навучэнцы 4 класа даведаліся цікавыя, пазнавальныя факты аб вірусах, прагледзелі сацыяльны ролік, даведаліся як не перадаецца ВІЧ. Адказвалі на пытанні, выказвалі сваё меркаванне аб шкодных звычках, якія губяць чалавека.

1 снежня ў 6 класе прайшла класная гадзіна "Аб бядзе пад назваю СНІД". Вучні пазнаёміліся з паняццямі СНІД і ВІЧ, прагледзелі відэаролік і абмеркавалі магчымыя спосабы распаўсюджвання гэтага страшнага захворвання, пагаварылі аб мерах прафілактыкі ВІЧ.







# Паездка ў Цэнтр бяспекі МНС



19 снежня вучні 6-9 класаў наведалі Цэнтр бяспекі МНС у горадзе Барысаве.

Перад пачаткам экскурсіі дзецям прадэманстравалі відэаролік аб правілах пажарнай бяспекі і праверылі іх веды падчас тэсціравання.

Потым вучні наведалі інтэрактыўную пляцоўку, дзе з дапамогай спецыяльных планшэтаў шукалі парушэнні правілаў бяспекі.

Падчас экскурсіі па спецыяльна абсталяваных памяшканнях рабятам нагадалі правілы паводзін пры задымленні, пры непагадзі (успомнілі нават аб шаравой маланцы), гаварылі аб правілах паводзін на лёдзе і аб спосабах дапамогі чалавеку, які тануў, звярнулі ўвагу дзяцей на правілы паводзін з незнаёмымі людзьмі.





Напрыканцы экскурсіі ўсе прысутныя атрымалі памяткі з правіламі бяспекі.

Наведванне Цэнтра бяспекі нікога не пакінула абыякавым. Экскурсія спадабалася ўсім без выключэння!!! А Далжук Дар'я, вучаніца 6 класа, падзялілася сваімі ўражаннямі з карэспандэнтамі тэлеканала "Беларусь 1".









# Сустрэча з інспектарам Дзяржынскага РАНС




У рамках акцыі "Бяспечны новы год" 21 снежня адбылася сустрэча са старшым інспектарам Дзяржынскага РАНС Смусёнак А.М.

Алеся Міхайлаўна расказала дзецям аб небяспецы піратэхнічных вырабаў. Таксама ў рамках сустрэчы з вучнямі былі праведзены квэст і віктарына на веданне правілаў бяспекі. Рабятам быў прадэманстраваны відэафільм "Правілы бяспечных паводзін на лёдзе". Кожны жадаючы змог прымерыць касцюм выратавальніка.

Дзеці з задавальненнем прынялі ўдзел у мерапрыемстве, а самыя актыўныя з іх атрымалі падарункі.













# Навіны школьнага лагера “Сонейка”



У школьным лагеры "Сонейка", які працуе падчас зімніх канікул, панавала переднавагодняя атмасфера: працавала "Майстэрня Дзеда Мароза". Рабяты сваімі рукамі зрабілі выдатныя навагоднія сувеніры.







# Навагоднія мерапрыемствы

27 снежня для выхаванцаў дзіцячага сада адбылося навагодняе свята. Хлопчыкаў і дзяўчынак чакала мора станоўчых эмоцый, вясёлых песняў і танцаў, а таксама сустрэча з Дзедам Марозам і Снягуркай!





29 снежня адбылося школьнае навагодняе свята. Вучні 1-9 класаў прынялі актыўны ўдзел у вясёлых конкурсах, вадзілі дружныя карагоды вакол навагодняй елкі, сустрэліся з Дзедам Марозам і Снягуркай і вядома ж атрымалі салодкія падарункі. Усе прысутныя зарадзіліся добрым настроем і станоўчымі эмоцыямі на новы год!!!










# Шосты школьны дзень




Штогод 1 снежня адзначаецца Сусветны дзень барацьбы са СНІДам. Ва ўсім свеце ў гэты дзень гавораць аб гэтым страшным захворванні і аб тым, якую пагрозу існаванню чалавецтва нясе гэтая глабальная эпідэмія.

Да гэтай даты ў школьнай бібліятэцы была афармлена **выстава "Што неабходна ведаць пра СНІД".** Увазе чытачоў былі прадстаўлены кнігі з бібліятэчнага фонду аб гісторыі ўзнікнення захворвання, аб шляхах перадачы віруса, сіндромах і групах рызыкі, лячэнні і прафілактыцы ВІЧ-інфекцыі.

Дадзеная літаратура расказвае пра небяспеку наступстваў дрэнных звычак, папярэджвае аб тым, што кожнаму трэба адказна ставіцца да свайго здароўя. На выставе таксама прадстаўлены плакаты, выраблены вучнямі, якія змяшчаюць інфармацыю аб смяротным вірусе, яго прыкметах, шляхах перадачы віруса і прафілактыцы захворвання.





10 снежня ў рамках мерапрыемстваў шостага школьнага дня вучні 5-8 класаў наведалі гарадскі каток і басейн, а для дзевяцікласнікаў быў арганізаваны відэалекторый "Наркотыкам - НЕ!". **Дзень здароўя** прайшоў цікава і з карысцю!






Галоўны рэдактар – Ярашэвіч Мар'яна, вучаніца 8 класа.
Газета выходзіць 1 раз у месяц на працягу навучальнага года.
Наступны нумар выйдзе 31 студзеня.
Тыраж – 15 нумароў. Кошт – 1 руб.